ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ ЗЛУЧАЙЦЕСЯ.

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 75 (1042) | ПАНЯДЗЕЛАК, 31-га сакавіка 1930 г.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК і Менскага АК ЛКСМБ

УМОВЫ ПАДПІСКІ:
1 месяц . . . 30 кап.
3 месяцы . . . 90 „
6 месяцаў . . . 1 р. 80 „
1 год . . . 3 р. 30 „

АДРАС РЭДАНЦЫІ: Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ: Комсамольская 25, тэлеф. № 903.

ГОД ВЫДАНЬНЯ Х.

Кошт асобнага №—2 кап.

Рэдакцыя газэты „Чырвоная Зьмена“ сумесна з падзівам 2 СКЛІКАЮЦЬ НАРАДУ
ЎСІХ КОМСАМОЛЬЦАЎ-ПЕРАМЕНЬНІКАЎ УНЕВАЙСКАВІКОЎ І ДАПРЫЗЫЎНІКАЎ.
1-га красавіка, а 7-й гадзіне ўвечары, у памяшканьні Дому Комсамолу па пытаньню:
„Аб задачах міжзборавай работы“
Дакладчык тав. АРЛОЎ. Яўка абавязкова.

НА ПЛЕНУМЕ ЦК КП(б)Б

НЕ ПАСЛАБЛЯЦЬ ТЭМПАЎ КОЛГАСНАГА БУДАЎНІЦТВА

НЕАДКЛАДНА ВЫПРАВІЦЬ ПЕРАГІБЫ І ПАМЫЛКІ. ПА-БАЛЬШАВІЦКУ ПРАВЕСЬЦІ ВЯСЕНЬНЮЮ СЯЎБУ

Спрэчкі па дакладу тав. ГАЛАДЗЕДА аб ходзе колектывізацыі і падрыхтоўцы да пасеўнай кампаніі*)

Спрэчкі, якія разгарнуліся па дакладу т. Галадзеда, былі накіраваны, галоўным чынам на мобілізацыю ўвагі ўсіх парторганізацый у барацьбе з перагібамі—„асноўнай перашкодай далейшых посьпехаў разьвіцьця і замацаваньня колгаснага руху. Факты грубейшых скажэньняў лініі партыі у пытаньнях колектывізацыі, якія мелі месца ў радзе раёнаў і аб якіх гарарылі таварышы з месц, сьцьвярджалі настойлівую патрэбнасьць самай рашучай барацьбы з памылкамі, скажэньнямі і перагібамі ў справе колектывізацыі, барацьбы, як з „левымі“ загібамі, так і асабліва з яўна-правай опортуністычнай практыкай.

Яўнае і захаванае супраціўленьне ўстаноўкам партыі ў політыцы на вёсцы, паданыя ў артыкуле т. Сталіна, лісьце ЦК УсеКП(б) і пастанове ЦК КП(б)Б, знайшлі сваё найбольш тыповае адлюстраваньне ў так званай „шклоўшчыне“. Гэта супраціўленьне антыпартыйных опортуністычных элемэнтаў павінна быць ліквідавана рашуча і хутка.

Вось гэтыя пытаньні і складаюць зьмест спрэчак.

За гаспадарча-організацыйнае ўмацаваньне колгасаў

Тав. Новікаў у сваім выступленьні падкрэсьліваў невыстарчальную ўвагу у радзе месц якаснаму гаспадарча-організацыйнаму ўмацаваньню колгасаў. Гналіся за лічбамі і мала думалі аб замацаваньні вынікау. Ён падае выпадак, калі адзін з работнікаў, камандыраваных у раён на дапамогу колектывізацыі спрабаваў перамагчы ўсе цяжкасьці штрафамі. Галоўнае—выправіць зробленыя памылкі і перагібы, без чаго немагчыма правядзеньне бальшавіцкай сяўбы.

Дырэктывы аб працы з батрацтвам і беднатой выконваюцца слаба

Тав. Манжалей паказваў на факты недапушчальна слабое ўвагі рабоце з беднатою і батрацтвам і нават на наяўнасьць паасобных выпадкаў, калі батракоў ня прымалі ў колгас. Паказальнікам слабога выкананьня дырэктыў ЦК аб рабоце сярод беднаты і батрацтва зьяўляецца ўцягненьне батракоў ў колгасы толькі на 31 процант, а па некаторых акругах і таго ніжэй.

Ударыць па тых, хто ўпарта не выпраўляе памылак

Тав. Хаскін паказваў на меўшыя месца ў Слуцкім раёне факты супраціўленьня пераводу колгасаў на новы статут.

— Гэты статут для нашага раёну не падыходзіць,—заяўлялі некаторыя работнікі, якія дагэтуль трымаліся мэтадаў адміністраваньня ў той-жа час работа з беднатою у раёне была амаль забыта. Так на Ўваравіцкім сельсавеце на запытаньне аб стане работы з беднатой, работнікі адказалі: прызнаёмся, што сходаў беднаты ня склікалі.

Там дзе праводзілася работа з беднатой, дзе партыйная організацыя па-бальшавіцку перабудавалася пасьля апошніх дырэктыў партыі, там мы маем зусім іначшае становішча.

Пробны выезд у поле паказаў баявыя настроі колгасьнікаў

Тав. Амбражунас (Гомель) гаварыў аб тым, што пасьля праведзеных па раёнах нарад партыйныя організацыі энэргічна ўзяліся за выпраўленьне раду перагібаў. Гэтым трэба вытлумачыць тое, што ў Гомельскай акрузе адсеў з колгасаў параўнальна меншы, чым у іншых акругах. Пробны выхад у поле, праведзены ў двух раёнах, паказаў баявыя настроі да сяўбы у колгасьнікаў, іх організаванасьць і садзейнічаў уздыму ў іншых колгасах. Адной з баявых задач у Гомельскай акрузе зьяўляецца забесьпячэньне колгасаў фуражом, на што трэба адпусьціць спэцыяльныя крэдыты колгасам.

Выкарчоўваць элемэнты ціхай „шклоўшчыны“

— Організацыя і гаспадарчае афармленьне колгасаў — асноўнае, што зараз стаіць перад намі,—сказаў **т. Чычэраў** (Віцебск). Найбольш небясьпечным зьявішчам у ажыцьцяўленьні дырэктыў партыі зьяўляецца так званая „шклоўшчына“. Элемэнты ціхай „шклоўшчыны“ ёсьць у шмат якіх організацыях. Мы сустракаемся з фактамі яўнага супраціўленьня дырэктывам ЦК.

Трэба даць магчымасьць колгасам правесьці самаачыстку ад яўна варожых і шкодніцкіх элемэнтаў. Гэта мерапрыемства дасьць колгасам толькі карысьць і ўзьніме іх аўтарытэт.

Аб антыпартыйнай адозьве Рагачоўскага РК КП(б)Б

Тав. Астапенка (Бабруйск), паказваючы на меўшую месца антыпартыйную адозву Рагачоўскага райкому, патрабуе самым рашучым чынам ударыць па скрыўленьнях і перагібах у ажыцьцяўленьні політыкі партыі. Трэба ўзмацніць увагу да індывідуальнага сэктару ў веснавой сяўбе, што часта забываюць.

Замацаваць дасягненьні і выканаць задачы вясновай сяўбы

Тав. Калнін (ЦКК) падаў рад яскравых фактаў, якія паказваюць, як ня трэба падыходзіць да колектывізацыі. Быў выпадак, калі адзін з работнікаў па колектывізацыі заявіў: „я сёньня арганізаваў 4 колгасы, а па дарозе дадому яшчэ адзін арганізую“! Ёсьць настроі, што артыкул т. Сталіна ня трэба было друкаваць, або апублікаваць яго пасьля сяўбы. Зразумела, што гэткія настроі вельмі шкодныя і нічога агульнага з бальшавіцкім разуменьнем пытаньня ня маюць. Пастанова шклоўскага райкому не выпадкова. Трэба жорстка біць па гэтых настроях, паколькі яны ўзбройваюць кулака і опортуністых. Далей тав. Калнін кажа, што трэба самым рашучым чынам рэагаваць на кожны выпадак скрыўленьня партыйнай лініі ў адносінах да серадняка. На жаль, не заўсёды так бывае. Адзначыўшы рад прарываў у падрыхтоўцы да сяўбы (контрактацыя, вапнаваньне) тав. Калнін скончыў заклікам да мобілізацыі ўсіх сіл партыйных організацый, каб замацаваць дасягненьні ў колгасным будаўніцтве і выканаць задачы, якія партыя паставіла ў сувязі з веснавой сяўбой.

Клясавы вораг шалёна дзейнічае

Тав. Соскін, характарызуючы становішча Клімаўшчыны, падаваў рад фактаў жорсткай клясавай барацьбы ў раёне, спробы кулакоў падкупіць беднату шляхам абяцаньня хлеба. Мелі месца выпадкі, калі кулацтва, падбухторваючы беднату на разбор абагуленага насеньня, абяцала выдаць беднаце па 2 кілё з кожнага пуду разабранага насеньня.

Правільна паказваючы на дасягненьні ў галіне колектывізацыі, тав. Соскін аднак ня даў належнай рашучай крытыкі меўшых месца ў Клімаўшчыне памылак і перагібаў. Гэта пашкодзіла правільнай ацэнцы становішча і мобілізацыі ўвагі на выпраўленьне памылак.

Генэральная праверка жыцьцёвасьці колгасаў—вясновая сяўба

На прыкладзе Гарадоцкага раёну **тав. Сянкевіч** паказвае да чаго даводзіць адсутнасьць барацьбы са спажывецкімі настроямі. Выхаваньне беднаты праводзілася не на вытворчых прынцыпах, а на спажывецкіх (падзел крэдыту, лесу і г. д.) Гэтыя настроі выявіліся ў паасобных выпадках пры раскулачваньні. Замест экспропрыяцыі сродкаў вытворчасьці часам бралі хатняе барахло. Гэтымі-ж настроямі тлумачыцца ўстаноўка „на комуну“. Чаго варта падобная комуна паказвае прыклад колгасу „Чырвоны Гарадок“, калі местачковае мяшчанства, стаўшы „комунарамі“, дзесяткамі ішло да доктара, каб атрымаць запіску аб хваробе і вызваленьне ад работы. Генэральнай праверкай жыцьцёвасьці колгасаў будзе веснавая сяўба. І калі колгасы пакажуць узор гаспадарнасьці і організаванасьці, дык ясна, што гэтым будзе забясьпечана далейшае разгортваньне колектывізацыі.

Узмацніць растлумачэньне політыкі партыі

Тав. Чарнушэвіч (Віцебск), адзначаючы вострасьць клясавай барацьбы вакол колгасаў, гаворыць аб неабходнасьці ўзмацніць растлумачэньне політыкі партыі на вёсцы сярод рабочых. Бо клясавая барацьба па розных каналах прасякае на фабрыкі і часта скарыстоўваецца варожымі пролетарыяту і партыі элемэнтамі. Асноўная задача—з усёй рашучасьцю ўдарыць па тых, хто сабатуе дырэктывы партыі.

У чым соцыяльныя карэньні скажэньняў партыйнай лініі

Тав. Васілевіч аналізаваў карэньні і прычыны меўшых месца памылак і скажэньняў лініі партыі ў пытаньнях колектывізацыі. Дырэктывы партыі па гэтым пытаньні былі своечасовымі, зусім выразнымі і правільнымі. Аднак, чым-жа вытлумачыць патрабаваньне опортуністычнымі элемэнтамі дыскусіі па артыкуле тав. Сталіна? Каб адказаць на гэта запытаньне, трэба мець на ўвазе невялікую праслойку пролетарыяту ў БССР і моцны націск на партыю дробна-буржуазнай стыхіі. Тав. Сталін падкрэсьліваў, што плян вялікіх работ ня можа быць выкананы без самаачысткі нашых радоў. Мы пачысьцілі партыю, але небальшавіцкія элемэнты там-сям засталіся; комсамол яшчэ не ачышчаны, савецкі гаспадарчы і кооперацыйны апарат не прачышчаны як належыць, профсаюзны таксама. І вось пры гэтых умовах, у сувязі з абвастрэньнем клясавай барацьбы, націск дробна-буржуазнай стыхіі быў больш моцны, чымся пры іншых умовах.

Мы маем выпадкі недаацэнкі серадняка, абароны кулака, спакойных адносін да дырэктыў партыі па рабоце з батрацтвам і беднатой. Было-б няправільна ўсё гэта тлумачыць віною выключна раёнаў. Магілеўскае акруговае кіраўніцтва недаацаніла шклоўскай справы, на працягу 20 дзён замазвала яе. Дзякуючы націску на раёны з боку акругкому, у Мазырскай акрузе процант колектывізацыі быў даведзены да 92. Гэта лічба была дасягнута шляхам перагібаў і адміністраваньня.

Націск наглядаўся і з боку некаторых цэнтральных органаў, якія на другі дзень пасьля артыкулу тав. Сталіна зьмяшаліся і рвануліся ў другі бок: напрыклад, Колгасцэнтрам была дана тэлеграма аб тым, што „усе ранейшыя дырэктывы скасоўваюцца“. Падобныя выпадкі мел. месца і ў некаторых іншых організацыях. Асноўным сёньня зьяўляецца выпраўленьне перагібаў. Таму трэба рашуча біць па тых, хто супраціўляецца гэтаму выпраўленьню і замазвае гэтыя перагібы. Другое—падоўжыць самаачыстку па лініі партыі, КСМ, усіх апаратаў, правесьці таксама самаачыстку колгасаў ад шкодніцкіх элемэнтаў. Тут мы павінны падыходзіць так, як гэта мы робім на заводах: шкодніцкім элемэнтам у колгасах няма месца. Масавы колгасны рух быў і застаецца. Суцэльная колектывізацыя Беларусі ў два гады будзе выканана пры ўмове мобілізацыі ўсёй організацыі на выпраўленьне перагібаў. Асноўным крытэрыем моцнасьці колгасаў будзе веснавая сяўба. За той кароткі час, што застаўся, трэба зрабіць усё, каб правесьці яе організавана і з посьпехам.

* Даклад тав. Галадзеда будзе зьмешчаны ў заўтрашнім нумары.

Дзеньнік пленуму ЦК КП(б)Бел.

Увечары 27-га гэтага сакавіка пачаў свае работы Пленум ЦК КП(б)Б. У парадку дню два пытаньні:

1) Аб ходзе колектывізацыі і аб пасеўнай кампаніі.

2) Аб выкананьні прамфінпляну.

Першае паседжаньне Пленуму было цалкам прысьвечана дакладу тав. Галадзеда па першым пункце парадку дню:

Аб ходзе колектывізацыі і пасеўнае кампаніі.

Савгас „Гігант“



На здымку: агульны від галоўнага пляцу саўгасу „Гігант“, які застаўлен трактарамі перад адпраўкай на вучасткі для сяўбы.

ЯНЫ НЯ ВАРТЫ ЗВАНЬНЯ ЎДАРНІКАЎ--У ІХ НЯ ВЫКАНАНЫ ПРАМФІНПЛЯН

Лёс фабрыкі „Адраджэньне" вісіць яшчэ ў паветры. Прарывы прамфінпляну ганьбяць фабрыку імя „Клары Цэткін"

Бяз лішніх слоў—практычна за працу па ліквідацыі прарываў!

ПРАМФІНПЛЯН ВЫКАНАН

За першы квартал 1930 году праца барысаўскага камбінату характарызуецца вялікай напружанасьцю на справу выкананьня прамфінпляну.

У гэты-ж час назіраюцца вялікія перабоі ў сэнсе забясьпячэньня прадпрыемстваў дастатковай колькасьцю добраякаснай сыравіны. Друкарня комбінату ў гэтым годзе мае ўжо дасягненьні ў справе выкананьня прамфінпляну ў параўнаньні з мінулым годам. На першы квартал г. г. была вызначана выпрацоўка продукцыі па пляну на суму 68525 рублёў супроць 67500 рублёў мінулага году.

Гэта складае 1,5 проц. павялічэньня вырабу продукцыі. Свой плян друкарня выканала з перавышэньнем. Сабекошт продукцыі зьніжан на 12,31 проц. супроць 2,13 проц. мінулага году. Сабекошт зьніжан за кошт экономіі матар'ялаў і іншых выдаткаў.

Вытворчасьць працы ўзьнялася дзякуючы павышэньню працоўнай дысцыпліны і шырокаму разгортваньню соцспаборніцтва. Недахоп забесьпячэньня сыравіны выклікае лішнія адміністрацыйныя выдаткі і перашкаджае падняцьцю вытворчасьці працы друкарні.

Гэтыя дасягненьні патрэбна ўтрымаць і павялічыць іх у далейшым.

В. МЭБЕЛЬ.

„Адраджэньне" у паветры

Фабрыка „Адраджэньне" за ўсё сваё існаваньне не складала ніводнага прамфінпляну. Яна працуе ў пацёмку і знаходзіцца зараз у такіх абставінах, што і самі адміністратары ня ведаюць, што рабіць, чакаюць цыркуляру зьверху.

Вялікая безгаспадарнасьць назіраецца на фабрыцы. Палова трохпаверховага будынку пустуе амаль нічым не занятая.

Барацьба за будынак

ВСНГ жадае забраць будынак пад рамонтныя майстэрні, а Наркампрацы не аддае і гаворыць, што „я будаваў і я ім буду карыстацца. Для гэтага я ператвару цацачную фабрыку ў школу для падрыхтоўкі кваліфікаванай рабочай сілы". Такая барацьба дае сябе значна адчуваць, бо і на сёнешні дзень фабрыка вісіць у паветры.

Прастой за прастоем

Дзякуючы склаўшымся абставінам і недахопу матар'ялу па цэхах адчуваюцца прастоі. У сьлясарным цэху на зборны ложак адсутнічае нікель і рабочыя ходзяць па цэху. шукаючы працы. Малярны цэх таксама амаль стаіць, бо ён залежыць ад бляшанага, у якім таксама не хапае матар'ялу і продукцыя выпрацоўваецца з старых банак, што пагражае павялічэньнем браку.

Страты ад безгаспадарнасьці

Шмат страчана грошай на закупку машын, якія зараз стаяць і ржавеюць, гніюць без патрэбы У сталярным цэху закуплены і зроблены варштаты, якія зараз гніюць на двары. У бляшаным раматуюцца больш году варштаты, з якіх ніякай карысьці няма.

Дзякуючы ўсім склаўшымся абставінам, як недахоп матар'ялу, адсутнічаньне кіраўніцтва, рабочыя пачынаюць пакідаць фабрыку, уцякаюць нават комсамольцы і некаторая частка комуністых.

Соцспаборніцтва на заводзе не адчуваецца. Ударныя брыгады не апраўдваюць свайго званьня, бо яны самі прызнаюць, што „якія мы ўдарнікі, калі палову рабочага дня гуляем".

У такім вытворчым прарыве грамадзкія організацыі кідаюцца ва ўсе бакі, каб зьнішчыць яго, але з гэтага нічога ня выходзіць.

Гордасьць фабрыкі

Адным з паказальнікаў, што на фабрыцы можна паставіць працу, зьяўляецца ліцейны цэх, які сапраўды зьяўляецца красуней і гордасьцю ўсёй фабрыкі. Ім кіруе старыя комуністы, энтузіясты тав. ВАРОНІЧ.

З прыходам на працу ў цэх, ён застаў 50 проц. браку з усёй выпушчанай продукцыі, ніводнай ударнай брыгады, а зараз пасьля цяжкай і ўпартай працы ён дабіўся пры дапамозе самі рабочых зьнішчэньня браку на 100 проц., павышэньня вытворчасьці працы на 50 пр.

Цэх абвясьціў сябе ўдарным, комуністычным і сапраўды калі да яго прыходу ня было партыйцаў, дык зараз іх большая палова.

Вось чым толькі фабрыка ганарыцца, але ўсё астатняе, як-бы затушоўвае гэтыя дасягненьні.

Гэтая чорная пляма, якая зараз ляжыць на фабрыцы, пры дапамозе добрага кіраўніцтва з вышэйстаячых гаспадарчых органаў і самых рабочых будзе зьнішчана і тады фабрыка запульсуе новым жыцьцём будаўніцтва.

Піла.

У барацьбе за „чырвоную"

Пасьля занясеньня фабрыкі „Везуві" на чорную дошку ў некаторых цэхах ужо назіраецца некаторы пералом, але яшчэ недастатковы.

Комсамольская ячэйка організавала тры комуны, у якіх ахоплены 32 маладых рабочых. Комунары за кароткі час дзякуючы сваім добрым адносінам да працы, вялікай вытрыманасьці адрозьніліся ад усёй рабочай масы і заваявалі вялікі аўтарытэт. За кароткі час існаваньня комуна ўзьняла вытворчасьць працы на 17 скрынак у дзень, паставіла сваёй задачай ліквідацыю прагулаў.

Пры належнай дапамозе і кіраўніцтве гэтыя комуны будуць сапраўднымі штурхачамі ў справе выкананьня прамфінпляну і барацьбе за заваяваньне чырвонай дошкі для фабрыкі „Везуві".

Д. Гурар'е.

Галярэя шкоднікаў



Ударнае невыкананьне прамфінпляну

Гомельская фабрыка імя Клары Цэткін прамфінплян за першы квартал выканала на 88,1 проц. Вялікі процант недавыкананьня даў самы галоўны цэх фабрыкі пераплётны, які выканаў заданьне толькі на 77,1 проц. Скрыначны цэх недавыканаў програму на 5,6 проц., кульковы—на 7 проц., пакетны—на 4,9 проц.

Продукцыйнасьць працы павысілася на 32,5 проц. замест 47,3 пр. Прагулы ў параўнаньні з мінулым годам павялічыліся на 0,7 проц., у скрыначным цэху наглядаюцца выпадкі пагоршаньня гатовых і паўгатовых фабрыкатаў. Дрэнна прыкройваецца паўфабрыкат ліцоўка і рэзка нікудышная.

Да авальных і паўавальных скрынак прыкройваліся нягодныя крышкі, што павялічыла колькасьць браку. У кулькавым цэху няправільна складаецца папера, якая атрымоўваецца касой і няроўнай.

Не малаважную ролю ў недавыкананьні асобных паказаньняў прамфінпляну адыгралі цякучасьць рабочай сілы і дрэннае амаль бязплянавае забесьпячэньне фабрыкі сыравінай і падсобным матар'ялам; асноўнымі прычынамі недавыкананьня прамфінпляну, бяспрэчна, належыць лічыць недастатковую работу фабрычных організацый у напрамку азнаямленьня масы рабочых з прамфінплянам, недаацэнка асаблівай важнасьці выкананьня прамфінпляну, слабае разгортваньне соцспаборніцтва і недастатковы ўдзел у ім як адміністрацыі, так і самых рабочых.

З 6-ці маючыхся на фабрыцы цэхаў прамфінплян абгаварваўся толькі ў адным цэху. Адсюль і поўны вынік, што большасьць рабочых не ўцяміла важнасьці выкананьня прамфінпляну ў тэрмін, што значна адбілася на пасьпяховым выкананьні яго ў першым квартале. Ёсьць шэраг выпадкаў недавыкананьня ўдарнымі цэхамі і паасобнымі ўдарнікамі ўзятых на сябе абавязацельстваў, а ў некаторых выпадках і злоснае парушэньне працдысцыпліны.

Закройны і пераплётны „ўдарныя цэхі" за дрэнную якасьць выпушчанай продукцыі і недапушчальнае адставаньне ў выкананьні прамфінпляну па пастанове вытворчай камісіі пазбаўлены званьня ўдарных. Дасягнутыя паказальнікі выкананьня пляну за студзень месяц

Частка рабочых, якія нядаўна прышлі на вытворчасьць, у пагоні за рвацкім заработкамі перабягаюць з заводу на завод. Рабочыя далі ім назву „лятуны"



Рвачы прыляцелі.

яскрава сьведчаць аб тым, што пры дастатковай увазе да справы з боку ўсяго рабочага колектыву фабрыкі можна было-б дабіцца добрых вынікаў.

Так, за студзень месяц вытворчая праграма па фабрыцы выканана ў сярэднім на 92,5 проц.; асобныя цэхі нават далі перавышэньне назначаных лічбаў. Скрыначны цэх заданьне выканаў на 103,6 проц., конвэртны-ж на 106 проц., фрэзыровачны на 116,2 проц

Цягнуцца ў хвасьце як і ў першым квартале цэхі: кульковы, выканаўшы програму на 84 проц., пераплётны—на 87 проц. і пакетны—на 83 проц. Да гэтага часу грамадзкая думка ня была згуртавана вакол прарыву першага кварталу, вакол работы ўдарных цэхаў, брыгад і асобных ударнікаў, вакол практычнай работы па соцспаборніцтву, дзеля чаго ўся праца ў гэтым напрамку ў заняпадзе. Неабходна зараз-жа мабілізаваць увагу па зьнішчэньню прарываў першага кварталу, на барацьбу за поўнае выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну.

Віт. Сідарук.

Не хапіла сыравіны

Гарбарня барысаўскага комбінату ня выканала свайго пляну. Па пляну прадугледжана выпрацоўка 3500 скур, выпрацавана 3286 скур, што складае недавыкананьне пляну на 6,15 проц.

Сабекошт зьніжаны з 17 рублёў 53 кап. за скуру да 17 рублёў 34 кап., што складае 1,09 проц. супроць павышэньня ў мінулым годзе на 9 проц. Ня гледзячы на гэта усё яшчэ назіраецца вялікае недавыкананьне вытворчай програмы.

Замест 14 тысяч скур, Скурсындыкат адпусьціў толькі 10 тысяч. Рабочых па пляну павінна было быць занята 46 чалавек, а іх было 42 чалавекі.

В. М.

Чыстка--фільтр нашых шэрагаў

АЧЫСЬЦІЦЬ ШЭРАГІ КОМСАМОЛУ АД УСЯГО ШКОДНАГА І НЕПАТРЭБНАГА НАМ

Міма гэтага факту нельга прайсьці

Пачалася чыстка студэнтаў комсамольцаў апошніх курсаў менскага Політэхнікуму з тэй мэтай, каб праверыць наколькі здолен кожны комсамолец, будучы чырвоным спэцыялістым, кіраваць паасобнымі вучасткамі соцыялістычнага будаўніцтва.

Чыстка пачалася з архітэктараў 4-га курсу. Зусім нядаўна быў з архітэктарамі такі выпадак—па пастанове НКЗ і Політэхнікуму амаль усе студэнты павінны ехаць на працу ў вёску. З гэтага і пачалося.

Гутаркі, крыкі і, нарэшце,—адмаўленьне ад паездкі працаваць. На вялікі жаль, тут былі ініцыятарамі комсамольцы, як, напрыклад, Бардзінскі, Ігнатовіч і інш. Пры абмеркаваньні гэтага пытаньня, ніхто з комсамольцаў належнага адпору ня даў гэтаму выпадку.

ВІХОР З.

Яму ня месца ў комсамоле

У ячэйцы профшколы будаўнікоў (Менск) ёсьць комсамолец Кітаевіч К., які лічыўся па ўсіх дакумэнтах сынам рабочага, на падставе чаго і атрымаў стыпэндыю. Але нядаўна бюро ячэйкі расьсьледаваўшы гэта пытаньне, знашло, што бацька Кітаевіча меў раней крупадзёрку, а пасьля сьмерці бацькі гэтай крупадзёркаю ўладаюць матка і брат Кітаевіча, на ўтрыманьні якіх знаходзіцца і комсамолец Кітаевіч К.

За крупадзёрку матка трымае патэнт 2-га разраду. Шэраг вучняў заяўляюць, што бацькі Кітаевіча да рэволюцыі займаліся гандлем, але ён гэта захоўвае

Акрамя гэтага за Кітаевічам лічыцца яшчэ шмат іншых спраў: так, будучы актывістым юнкорам, ён ведаў, што з ім вучыцца пазбаўленец і не паведаміў аб гэтым ні комсамольскую ячэйку, ні адміністрацыю школы.

Вось сапраўдны твар актывістага „рабочага" Кітаевіча. На падставе ўсіх маючыхся фактаў бюро і агульны сход ячэйкі выключылі чужака з комсамолу.

Але невядома па якіх прычынах конфліктная камісія Фрунзэўскага райкому ЛКСМБ адмяніла пастанову ячэйкі і аднавіла Кітаевіча ў комсамоле.

Вілы.

Ен не павінен чысьціць

У тройку па чыстцы комсамольскай ячэйкі менскага політэхнікуму ўвашоў т. Караеў, які ні ў якім разе не павінен быць у тройцы па чыстцы. Ня можа быць таму, што ў бытнасьць яго сэкратаром ячэйкі заводу «Комунар», ён давёў ячэйку да распаду, аб чым ужо пісалася ў газэце „Чырвоная Зьмена", абараняў рвачоў і сам ад парттройкі за рвацтва атрымаў вымову. Ён-жа (на чыстцы партыі гэта выявілася) зьяўляўся душыцелем жывой ініцыятывы і крытыкі.

Па нашаму Караеў ня можа быць у тройцы па чыстцы комсамолу.

Мікола.

Кожная ячэйка—баявы атрад

па організацыі соцыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва ў колгасах, па організацыі дысцыпліны і баявому правядзеньню вясеньняй сяўбы

Колгас імя Сталіна выканаў загад партыі—падрыхтаваўся да сяўбы

МАЦУЮЧЫ КОЛГАСНЫЯ ГАСПАДАРКІ, ЦЭМЭНТУЮЧЫ ІХ БАТРАЦТВАМ І БЕДНЯКАМІ—ЛІКВІДУЕМ КУЛАЦТВА, ЯК КЛЯСУ

Сяўбовай кампаніі па Віцебскай акрузе пагражае зрыў

Шэраг акруговых арганізацый бязьдзейнічаюць

Віцебск, 29. 28 сакавіка на 8 акруговых установў і 4 прадпрыемствы, якія маюць непасрэднае дачыненьне да вясеньняй пасеўнай кампаніі, быў утворан налёт па праверцы іх падрыхтоўкі і дапамогі ў правядзеньні вясеньняй сяўбы.

Пры налёце на майстэрні дарожнага аддзелу выяўлена, што ў майстэрнях знаходзіцца **тры трактары „Фордзон"**, якія патрабуюць **вялікага капітальнага рамонту**, але дзякуючы адсутнасьці запасных частак да рамонту на сёньняшні дзень **ня приступілі**.

Акрпалеводсаюз запрасіў „Бельсельдзяржснаб" аб прысылцы неабходных для рамонту частак—правага колы і 15-зубнай шэсьцяронкі, а апешні прыслаў **левае кола і 10-ці зубную шэсьцяронку**. Згодна дагавору рамонт трактараў павінен быць закончаны ў гэтым месяцы (сакавіку), але невядома ці будуць яны адрамантаваны ў красавіку.

Між тым пры налёце на таварную станцыю выяўлена **злачынная валакіта з трымя вагонамі запасных частак для трактароў, якія адпраўлены 13 сакавіка** з Мурманску ў Менск, Смаленск і Адэсу і павінны былі прыбыць туды 24 сакавіка. Але, апошнія **дзякуючы нядбайнасьці**, на сёньняшні дзень марынуюцца на станцыі, ня гледзячы на тое, што яны адпраўлены шпаркай хуткасьцю.

Два замежных плугі для трактароў на працягу тыдню таксама ляжаць на станцыі і ніхто іх не адпраўляе па назначэньню.

Зусім нездавальняючае становішча з рамонтам сельска-гаспадарчага інвэнтару. Сампрамсаюз нічога ня ведае аб колькасьці організаваных майстэрняў і адрамантаванага сельска-гаспадарчага інвэнтару. Праўленьне працуе з халадком.

Пры налёце на майстэрні МББ выяўлена, што з 75 плугоў, якія павінны быць дастаўлены Палляводсаюзам на рамонт, дастаўлена толькі 30 з якіх майстэрнямі адрамантавана толькі 11.

Паляводсаюз злачынна паволіць з дастаўкай другіх машын для рамонту. Адміністрацыя майстэрні нядбайна адносіцца да рамонту інвэнтару. Рамонт робіцца толькі ў звыштэрміновы час, ня гледзячы на пастанові ўраду аб рамонце ў рабочы час. **Грамадзкая думка рабочых** вакол скарэйшага адрамантаваньня і адпраўкі сельска-гаспадарчага інвэнтару **НЯ СТВОРАНА.**

Пры налёце на акркалгассаюз выяўлена, што рабочыя пляны па акрузе былі складзены толькі на 50-55 проц. і то апошнія амаль усе перарабляюцца. З боку акркалгассаюзу няма дастатковага кантролю і кіраўніцтва райкалгассаюзамі. Пераход калгасаў на новы статут арцеляў праводзіцца вельмі павольна. Заданьне па збору задаткаў на трактары выканана толькі на 30 проц., многія раёны выканалі заданьне толькі на 5-6 проц., а Бешанковіцкі раён заданьне выканаў **на... 0,25 проц.**

Пры абсьледваньні Віцебскага раёну выяўлена, што ў колектывізацыі дапусьцілі шмат перагібаў (Рудніцкі сельсавет), дзякуючы чаму наглядаецца значны адсеў з колгасаў. Пераведзена на новы сельска-гаспадарчы статут усяго 30-35 пр. колгасаў. **Перагібы выпраўляюцца марудна.** Пытаньні аб пераходзе на новы статут, чысткі колгасаў, папярэдне не абгаварываюцца на сходах беднаты (колгас „Княжыца"). Пробных выхадаў у поле ня было і да гэтага раён ня рыхтуецца, а падрыхтоўкай да сяўбы індывідуальнага сэктару РВК **не займаецца.**

Да наладжваньня грамадзкага харчаваньня ў колгасах спажыўсаюз не прыступіў. Па пляну намечана адчыніць у колгасах 35 сталовых з прапускной здольнасьцю па 500 абедаў кожная і толькі 16 сакавіка на месцы дано распараджэньне аб організацыі гэтых сталовых.

Становішча з нарыхтоўкай пасенных матар'ялаў дрэннае. Так, напрыклад, Цімафееўкі загатоўлена толькі 1,9 проц.

Адсюль вывады, што пасеўная кампанія па акрузе **ў шмат якіх мясцох можа быць сарвана, дзякуючы нядбайным адносінам з боку цэлага шэрагу акруговых організацый.**

Віноўныя павінны быць безадкладна прыцягнуты да суровай адказнасьці. Памылкі павінны быць зараз-жа выпраўлены.

Х. Бацьвінік.

Віцебск.

У бой за бальшавіцкае правядзеньне сяўбы

Комсамольская організацыя Нова-Беліцы разгарнула працу па дапамозе вёсцы ў галіне яе колектывізацыі і ліквідацыі кулацтва, як клясы. Ад фабрыкі „Вэзуві" паслана ў вёску маладзёжная рамонтная брыгада, якая зараз працуе там добра. Шэраг комсамольцаў працуе па організацыі колгасаў, наладжваньні работы ўнутры колгасаў і замацаваньню іх.

Ня дрэнна праведзена праца па мобілізацыі комсамольцаў актывістых у якасьці сэкратароў сельсаветаў. У вёску ўжо прыехалі для гэтай мэты комсамольцы. Адзін з комсамольцаў зараз абраны ў якасьці старшыні сельсавету.

Новабеліцкі РК комсамолу пастанавіў падараваць трактар нашаму шэфу—Уваравіцкаму раёну суцэльнай колектывізацыі да вясновай сяўбы гэтага году.

Для гэтай мэты адпрацэвалі суботнікі колектывы: фабрыкі „Вэзуві", лесазаводу „Колпраца", ячэйкі ЦРК і будаўнікоў. Астатнія-ж ячэйкі ў гэтай галіне яшчэ не пераключыліся.

Была таксама пастанова аб пасылцы ячэйкай лесазаводу „Колпраца" рамонтнай брыгады ў колгас „Энгельс", але яе покуль што ня выканалі.

Слаба прасоўваюцца ў колгасы кніжкі па колгаснаму будаўніцтву і вясеньняй пасеўнай кампаніі.

Трэба яшчэ больш разгарнуць працу па ўдзелу комсамольскай організацыі ў вясеньняй сяўбе, у колектывізацыі сельскай гаспадаркі.

Ад гарадзкіх комсамольскіх організацый – комсамольскія ячэйкі колгасаў і вёскі патрабуюць усямернай дапамогі.

Яшчэ больш аддамо сваю ўвагу колгаснаму будаўніцтву і ліквідацыі кулацтва, як клясы. Узмацнім культурна - выхаваўчую работу ўнутры колгасу.

Гэтага ад нас патрабуе справа колектывізацыі і вясеньняя пасеўная кампанія.

МІХАСЬ ІТКІН.

Вы не павінны адставаць

Газэта „Зьвязда", сумесна з ЦКК, Наркамземам і Колгасцэнтрам організуе 7-мідзённую праверку падрыхтаванасьці раёнаў БССР да сяўбы. Падтрымліваючы пачынаньне „Зьвязды" у правядзеньні найважнейшага мерапрыемства—організацыі грамадзкага кантролю над падрыхтоўкай да вясеньняй сяўбы, газэта „Чырвоная Зьмена" ўключаецца ў правядзеньне гэтай баявой задачы, ставячы сваёй мэтай праверыць падрыхтаванасьць раёнаў да сяўбы, садзейнічаць неадкладнаму выпраўленьню недахопаў падрыхтоўкі і праверыць наколькі своечасова акруговыя і раённыя організацыі і ўстановы рэагуюць на недахопы і перагібы.

У гэтым аглядзе агромністую ролю грае „лёгкая кавалерыя". Задача „лёгкай кавалерыі", не марудзячы ні сэкунды, праверыць гатоўнасьць колгасаў да севу. Ці ўсё зроблена для таго, каб нашы колектыўныя гаспадаркі маглі гэты экзамен вытрымаць? Заметкі юнкораў, друкаваныя на старонках нашай газэты, гавораць аб тым, што яшчэ ня ўсё зроблена для таго, каб сапраўды па-бальшавіцку сустрэць вясну.

Надзвычайна слаба ідзе загатоўка і разьмеркаваньне ўгнаеньня і машын, ня ўсе колгасы ўзброены рабочымі плянамі, ва многіх колгасах яшчэ не праведзена земляўпарадкаваньне, не забясьпечана організацыя коннацягавай сілы, няспраўны інвэнтар. Стварыўся прарыў між кольк асным ростам колгасаў і іх унутраною моцнасьцю, гатоўнасьцю да важнейшага рашаючага этапу —вясеньняга севу.

Ва многіх мясцох колгасы ад організацыйнай талкатні і шуміхі не павярнуліся яшчэ да гаспадарчай падрыхтоўкі севу.

Задача „ЛК" бесьперапынна штурхаць належныя організацыі для таго, каб на гэтым фронце не ўтварылася прарыву.

А для гэтага ў працы „кавалерыстых" патрэбна масавасьць, гласнасьць, каб аб гэтай працы ведала ўся краіна. Таму „кавалерысты" павінен быць юнкорам. Павінен уключыцца ў агляд, у які ўключылася і газэта „Чырвоная Зьмена". Пісаць аб добрых і дрэнных бакох падрыхтоўкі.

Наша задача асьвятляць ход падрыхтоўкі, штурхаць тых, хто адстае, біць па тых, хто не жадае выправіць памылкі і паказваць працу лепшых.

„Кавалерыстыя", юнкоры, вы не павінны адставаць!

Час вылічваецца днямі.

Мы чакаем ад вас матар'ялаў!

АДЗІН З МНОГІХ

Пра колгас імя Сталіна ў Талочынскім раёне

Колгас імя **Сталіна** з'організаваны ў бышым маёнтку Багрынава, Талочынскага раёну.

Ён існуе ўжо тры гады.

Спачатку організацыі колгасу ён быў засьмечаны пераважна пазбаўленцамі—людзьмі, якія прышлі на гаспадарку не для таго, каб організаваць яе і ўтварыць колгас, які-б адпавядаў задачам рэконструкцыі сельскай гаспадаркі, але для таго, каб з гэтага маёнтку выкарыстаць некаторыя сродкі і загнаць сабе ў кішэні.

Меўшыяся будынкі бышымі **„колгасьнікамі"** разбурваліся для апалу печаў. **Панавала поўная безгаспадарнасьць, рвацтва і злачынства. Гэта і вымусіла мясцовыя організацыі разагнаць кучу шкоднікаў, якія пралезьлі з варожымі мэтамі.**

Колгас абнавіўся.

Распачынаць работу ў колгасе, ня маючы амаль ніякіх сродкаў, было вельмі цяжка. Прыходзілася недаесьці і недаспаць. **Колгасьнікі організавана бяруцца за тое, каб наладзіць гаспадарку і распачаць сваё новае жыцьцё.**

Гэтага яны дасягаюць.

Гаспадарка паступова пачынае ўзьнімацца, набываецца інвэнтар і інш., але тут таксама існуюць супярэчнасьці.

Напрыклад, колгасьнікі систэматычна наймаюць рабочую сілу і інш. Маёмасьць, рабочая жывёла і інш. не абагулены, а лічацца ўласнымі. Усё гэта ў самым колгасе ўзнясла зайздрасьць між яго членамі, выклікала імкненьні мець больш кароў, коняй і інш., а ўсё гэта спрыяла таму, што **нельга было паставіць работу колгасу на належную вышыню.**

Кіраўнікі колгасу ў былым ня былі прасякнуты задачамі колгаснага будаўніцтва, яны саматужнічалі, як і самі колгасьнікі і не давалі правільнай устаноўкі ў справе організацыі сапраўднага колгасу.

Прышлося ізноў рабіць некаторыя захады.

Калі паўстала пытаньне наконт абагуленьня жывёлы, колгасьнікі разбазарылі 26 галоў свае жывёлы. Гэта паказала яшчэ раз, што ў колгасе існавалі нездаровыя настроі.

Зараз усё гэта зьменена.

Кіраўніком колгасу зьяўляецца цяпер вылучэнец, малады рабочы, комсамолец Барысаўскіх заводаў—**Мінакер Арон.**

Прышоўшы ў колгас, ён убачыў усе гэтыя недахопы, якія перашкаджаюць выкананьню задач, пастаўленых партыяй на вёсцы.

Пачалася перабудова работы.

Разам з колгасьнікамі вылучэнец Мінакер распачаў работу. Складзены вытворчыя пляны. Пачалося жыцьцё не сямейнай групы, а групы колгасьнікаў, якія ставяць шырока задачы колгаснага будаўніцтва.

Рамантуюцца памяшканьні, будуецца новы дом. Паляпшаюцца ўмовы быту колгасьнікаў. Колгасьнікі законтрактавалі свае пасевы, малако і інш.

„Рыцар колектывізацыі"



Комсамолец Мінакер—кіраўнік колгасу імя „Сталіна"

Па сваім размаху колгас невялікі—104 дзесяціны зямлі, з якіх 30 дзесяцін сенажаці. Маецца 9 дзесяцін саду.

У колгасе зараз налічваецца 39 кароў і 6 цялят. Трэба сказаць, што **колгаскія каровы надзвычайна каштоўныя**, некаторыя з іх даюць па 16 літраў малака, ёсьць адзін бугай. Коняй 18, авечкі і сьвіньні. Наведвальнікі сяляне, убачыўшы вялізарнага, **пудоў 18 кабана** зьдзіўляліся, як гэта лўрэі могуць выкармліваць такую аграмадзіну.

Колгас ужо падрыхтаваны да вясеньняй пасеўнай кампаніі. Колгасьнікі даўно адсартавалі свае насеньне, адрамантавалі інвэнтар. Паставілі, як кажуць, усё на поўны ход.

Прасачыўшы за процэсам падрыхтаванасьці да сяўбы, адразу заўважваецца, што ў калгасе ўсё гэта праходзіць плянава, бяз лішняй мітусаніны і блытаніны. Колгасьнікі, плянава абмяркоўваючы неабходныя мерапрыемствы ў сваім колгасе, па-бальшавіцку падрыхтаваліся да сяўбы.

Генэральная праверка падрыхтаванасьці ўсіх сродкаў, растаноўка сіл па брыгадах паказваюць, што колгас па-бальшавіцку правядзе сеў.

Колгасьнікі зараз робяць парадкі ўнутры колгасу, і кінулі сродкі і сілы ў прымежныя нова-організаваныя колгасы для падрыхтоўкі сяўбы.

Горш справа абстаіць з батрацка-бядняцкім ядром у колгасе. Многа прышлося весьці адпаведнай работы для таго, каб у колгас уцягнуць батракоў і беднякоў. Напрыклад, калі кіраўнік **Мінакер** на сходзе колгасьнікаў паставіў пытаньне аб прыёме батрака **Маханькова** у колгас, дык некаторыя колгасьнікі, напрыклад **Клябанаў**, імкнуліся сарваць гэтае, даводзячы сходу, што батрак **Міханькоў** „лодыр" і іншае. Гэта гаворыць за тое, што сярод колгасьнікаў яшчэ ёсьць настроі несумяшчальныя з задачамі сёньнешняга дня.

У колгас пачынае прыходзіць батрацтва і бядняцтва. Батрацка-бядняцкае ядро расьце. Гэта кажа за тое, што колгас паступова будзе ісьці ўперад, стаўшы на правільныя рэйкі.

Вылучэнец **рабочы Мінакер адпавядае свайму прызначэньню, умела і талкова кіруе работаю колгасу. Аб гэтым колгасьнікі самі гавораць і яго як кіраўніка хваляць.**

Колгас знаходзіцца ў асяродку нова-організаваных колгасаў: „Беларуская Вёска", „Чырвоная Зьмена", „Волкавіч" і інш. І таму стаіць задача, каб колгас імя **Сталіна** зьявіўся ў будучым асяродкам, аб'яднаўшы навокал сябе ўсе нова-організаваныя колгасы, **стварыўшы магутны гігант-колгас.**

Побач з гэтым трэба, каб колгас стаў інтэрнацыянальным.

Неабходна павесьці культурна-масавую выхаваўчую работу сярод колгасьнікаў, якое на сёньнешні дзень яшчэ няма.

Я. Красуцкі.

Грамадзкае харчаваньне—на агляд мас!

Пастаноўка справы грамадзкага харчаваньня не адпавядае запатрабаваньням сучаснасьці

Грамадзкае харчаваньне на апошнім месцы

(Ад нашага спэцкора)

Тыдзень таму назад у раёнах Віцебскай акругі і ў самім горадзе пачаўся агляд грамадзкага харчаваньня. Да агляду павінна быць прыцягнута ўся грамадзкая ўвага пайшчыкаў і ў першую чаргу работнікаў сталовак і Віцебскага ЦРК, але на вялікі жаль, трэба констатаваць, што на сёньнешні дзень вакол грамадзкага харчаваньня ня створана грамадзкая думка шырокіх працоўных мас.

Працаўнікі Віцебскага ЦРК і саюзу Нархарчу далей сваіх габінэтаў нікуды ня вышлі. Зьвернемся да фактаў.

Сталоўка № 2 Віцебскага ЦРК адна з галоўных сталовак гораду, у якой заўсёды шмат народу. Яна пры належным гаспадарчым кіраўніцтве змагла-б зьявіцца паказальнай сталоўкай, але на вялікі жаль гэтага на сёньнешні дзень няма. Сталоўка зьяўляецца прытулкам для п'яніц.

Яе наведваюць розныя людзі—адны прыходзяць каб што-небудзь пасьнедаць, а другія — п'янстваваць. Апошніх нямала ў сталоўцы. З фасону бяруць яны па 1-2 бутэлькі квасу ці сітро, а потым дастаюць з кішэняў „сьвятую“ 40-градусную, альбо што-небудзь мацнейшае і пачынаюць „мітынгаваць“.

Недалечка ад нашага століку сядзелі і п'янствавалі тры чалавекі. Па іхняй гутарцы і кпінам, якія яны кідалі сядзеўшаму недалёка ад іх комсамольцу-ўдарніку, можна было даведацца, што гэта рабочыя, але з якога прадпрыемства, цяжка было даведацца. Яны ўвесь час дакаралі маладога рабочага за тое, што ён ударнік і комсамолец. Адзін з іх, чырвоны як рак, трасучы кулаком, агітаваў за савецкую ўладу, але скардзіўся, што няма дзе піць (хоць гэтаму ў сталоўцы Віцебскага ЦРК № 2 ніхто не перашкаджаў).

А што рабілі ў гэты час адміністратары, афіцыянты, і тыя людзі, якія павінны сачыць за гэтым? Нічога.

Яны гэтага не заўважаюць, а калі і да заўважаюць, то прымаюць выгляд быццам-бы нічога ня бачаць.

Публіка таксама, як і тыя людзі, якія адказваюць за забараненьне п'янства ў сталоўцы, раўнадушна адносяцца да гэтых п'яніц.

* * *

Нам прышлося наведаць сталоўку інвалідаў. Шыльды з надпісамі „Распивать спиртные напитки в столовой запрещ ется“, якія вісяць на сьценах, абрасьлі плесеньню і працягнуты тоненькімі ніткамі павуціны.

У гэтай сталоўцы, як і ў сталоўцы № 2, поўна п'яніц. Адміністрацыя сталоўкі, таксама, як і адміністрацыя Віцебскага ЦРК, у прыватнасьці сталоўкі № 2 раўнадушна і з ухмылкай на твары паглядае на сваіх наведвальнікаў, якія пад дахам сваіх сталовак спакойна п'юць.

Якасьць абедаў Віцебскага ЦРК куды горшая, чым у сталоўках іншых гарадоў і нават сталоўках інваліднай коопэрацыі Віцебску.

На старонках „Віцебскага Пролетарыя“ за апошні час зьмешчан шэраг допісаў аб дрэнным становішчы грамадзкага харчаваньня ў Віцебску.

Рабкор **Бельсон** піша: „**Вельмі дрэнныя абеды**, Віцебскі ЦРК накіроўвае на фабрыку Лекерта. Я—піша тав. Бельсон,—ня пішу ўжо аб тых дадатках да абеду ў выглядзе тараканаў, кавалкаў дрэва і інш., якія часта пападаюцца ў абедах. Але і сам абед нікуды няварты—дрэнна згатоўлены“.

За 22 сакавіка ў „**Віцебскім Пралетары**“ зьмешчана памятка рабочым брыгадам па абсьледаваньню грамадзкага харчаваньня, у памятцы—31 пункт. Ніводнага слова ў пунктах няма аб праверцы работы адміністрацыі сталовак, кіраўніцтва грамадзкага харчаваньня. Ніводнага слова ня сказана аб праверцы работы афіцыянтаў, аб іх барацьбе з алкагалізмам, у якім тонуць усе сталоўкі гораду Віцебску. Аб гэтым, відаць, забыліся напісаць тыя, хто складаў гэтую памятку.

Грамадзкае харчаваньне ў Віцебску павінна быць палепшана. Віноўныя павінны несьці за такія парадкі суровую адказнасьць.

Віцебск. Х. Бацьвінін.

Вырашыць пытаньне

Ужо некалькі год студэнцкая сталоўка пры РПТ у заняпадзе. Да гэтага часу як студэнцкія організацыі, так і адміністрацыя пытаньнем палепшаньня яе працы не займалася. Студэнтам прыходзіцца галадаць. Трэба гэта пытаньне вырашыць, альбо перадаць сталоўку пад ведама ЦРК, як гэта робіцца ў іншых тэхнікумах, альбо калі будзе існаваць студэнцкая сталоўка, дык трэба зрабіць так, каб яна была сапраўды забясьпечана адпаведнымі продуктамі.

Рагачоў. Юнкор.

Адвакат кулацкага адваката

Рабфакавец Мікола Хведаровіч у ролі абаронцы кулака Алеся Вечара

Зусім зразумела чаму машчыцкі кулак Алесь Вечар—нахабна пускае атрутны пыл у вочы сваіх абвінавальнікаў у той час, калі выкрываюць яго скурніцкую дзейнасьць.

Вывучэньнем справы Вечара заняўся БелАПП і ў зьвязку з тым, што Вечар настойліва абзываў паведамленьне мясцовых як савецкіх, так і партыйных органаў—кулацкай хлусьнёй і цкаваньнем падкулачнікаў нізавога апарату—БелАПП прымушаны быў паслаць спэцыяльнага чалавека на месца, для дакладнага азнаямленьня са справай.

Вярнуўся прадстаўнік. Вывады бязьлітасны—Вечар лічыцца едаком моцнай кулацкай гаспадаркі (33 дзесяціны зямлі) у дваровы прыбытак сваёй пэнсіі ён ня ўносіць, чым спрыяе памяншэньню сельска-гаспадарчага падатку, за контррэвалюцыйную дзейнасьць брат Вечара высылаецца, гаспадарка раскулачваецца, знаходзяцца лісты, якія з поўнай выразнасьцю паказваюць твар пісаўшага іх Алеся Вечара, як скурніка, шкодніка, кар'ерыста, і хадатая па кулацкіх справах.

Пры наяўнасьці яшчэ таго факту, што Вечар выкарыстоўваў сваё службовае палажэньне (рэдактар „Шляхоў Колектывізацыі“) у мэтах абароны кулацтва—бюро Менскай філіі і БелАПП'у ўхваліла вывесьці Вечара са складу бюро філіі і выключыць з Беларускай Асоцыяцыі Пролетарскіх Пісьменьнікаў.

Вось тут і пачалася новая дзейнасьць Вечара. Бачачы тое што паперкам не даюць больш веры, што выкрыта іх фальшывая сутнасьць—Вечар надумаўся шукаць паратунку між жывых людзей. І думае це не знайшоў? Знайшоў! Ды такога дасужага чалавека, які гарой выступіў супроць „неразумных нападкаў на непавіннага Вечара“.

28 сакавіка, калі пастанову бюро Менскай філіі БелАПП'у павінен быў разглядаць сход філіі—Вечар прывёў сабе адваката рабфакаўца **Міколу Хведаровіча** (не БелАПП'аўца Чарнышэвіча) і той „нічтоже сумяшася“ прыступіў да выкананьня ролі добрасумленнага абаронцы „потерпевшего за правое дело“ Вечара. Што і казаць, абаронца Мікола Хведаровіч так захапіўся рольлю (вверенной ему) Вечарам, што хлусьнёй апярэдзіў самаго Вечара.

Узяць хоць-бы той факт, што на адным з паседжаньняў Алесь Вечар сам прызнаўся ў тым, што „апухаўся ў моцы сваёй гаспадаркі“. Мікола-ж Хведаровіч горача пратэстуе супроць „блеччынства“, учыненага над кулацкай гаспадаркай Вечара і заяўляе, што „знаў Вечара, як чацьвярціньніка“.

Што азначае чацьвярціньнік?—пытаюць яго. І Хведаровіч тлумачыць.

— Гаспадарка на 8-9-ці дзесяцінах зямлі, дзе мелася два кані, дзьве каровы і ніколі ня было парабкоў. Прычым, хоць і дадае, але ён лічыць важным тое, што ведаў гаспадарку **Вечара** ў 1924 г.

Якая брыдкая роля Хведаровіча—сам Вечар казаў, што „к двум асноўным каням у гаспадарцы меліся трохгадовыя „жаробачкі“, а здаралася і тое, што пры асноўных двух каровах меліся „цялушкі“. Вядома „жаробачкі“ з „цялушкамі“ ў акладны ліст не траплялі, бо сам Вечар казаў—„мае нядурную галаву на плячох, ды яшчэ з вышэйшай сельска - гаспадарчай адукацыяй“.

Хведаровічу ні пачом тое, што з гаспадаркі Вечара судом спаганяецца ў карысьць батрака больш 1000 рублёў, ня хоча ведаць Хведаровіч і таго, што 2-3 часткі машчыцкай зямлі захаваны былі ад падатку,—ведае і чамусьці лічыць правільным Хведаровіч тое, што Вечар вучачыся ў Горацкай сельска-гаспадарчай акадэміі атрымліваў дзяржаўную стыпэндыю, абвінавачвае органы ўлады і нават рэдакцыю «Зьвязды» ў штучным заблытваньні абвінавачваньня Вечара і яго брата.

Але Хведаровіч і на гэтым ня спыняецца, ён не задаволены „ганьбаваньнем“ падатковых органаў, ён шле маланку з перунамі і на галаву БелАПП'аўскага прадстаўніка, які сабраў „неадпавядаючыя сапраўднасьці, хлусьлівыя весткі сярод кулакоў, з якімі на сьмерць (?) рэзаўся Вечар за колектывізацыю Машчыц“.

Сход Менскай філіі БелАПП'у падцьвердзіў пастанову бюро. Вечар выключаны з БелАПП'у. Але адвакат кулацкага адваката Хведаровіч атрымаў слабы адпор.

— Організацыям рабфаку трэба знайсьці прычыны, выклікаўшыя бязглуздае выступленьне, трэба бліжэй прыгледзіцца ці ня будзе Мікола Хведаровіч—Вечар № 2, ці ня варта яго датэрмінова вызваліць ад абавязкаў будучага кваліфікаванага хадатая па кулацкіх справах.

Слова за рабфакам!

Т. П.

Чырвонаармейцы эскадрону сувязі №-скай кавдывізіі абсталёўваюць тэлеграфную клясу

Маленькі фэльетон

„Гром перамогі, раздавайся“

У 10 гадзін зазьвінеў тэлефон у партколективе:

— Звоняць з райкому. Прышліце Кастуся Аніісковіча ў часе сьнеданьня да нас. Абавязкова...

— Добра, прышлем.

У часе сьнеданьня Кастусь пайшоў у райком. Там яго „ўрачыста“ спаткалі:

— Вось, браток, табе літаратура (6 кніжок), зараз выпішам камандыроўку і каці ў вёску па колектывізацыі.

— Ды пачакайце, дайце я...

— Э, браток, тут патрэбны звышамэрыканскія тэмпы, а ён пачакайце... Зьбірай манаткі і кацi. Сёньня а 4-й гадзіне адыходзіць цягнік. Толькі ведаеш, што дружок?—не падкачай. Ніякіх там хістаньняў, каб ні ўправа, ні ўлева, рэж прама, па-бальшавіцку. Але ведай адно, твой раён павінен быць колектывізаваны! Хоць трэсьні, а выканай!

— Да вы растлумачце...

— Ды якія там зараз тлумачэньні... Кацiся дамоў, зьбірай манаткі і на клясавы фронт!

Пакруціў у руках Кастусь „літаратуру“, якую яму далі, махнуў са злосьцю рукой і пайшоў дамоў „зьбірацца на клясавы фронт“.

* * *

Урачыста адчыніўся сход сялян. Аніісковіч зрабіў даклад аб суцэльнай колектывізацыі з музычным аформленьнем. З „задавальненьнем“ праслухалі яго „тронную прамову“. Яму здавалася, што ён разгадаў нутро сялян, улічыў усе ўмовы і магчымасьці і „бязумоўна перамог“. А таму, пасьля дакладу, ён адразу паставіў пытаньне „ва-ўпор“, „па-бальшавіцку“:

— Якія за колгасы—прашу падняць рукі.

Молатам ударыла ў голаву. Ніводнай рукі.

— А-а-а. дык вы свалата пад кулацкім уплывам? Дык вы об'ектыўныя контр - рэволюцыянэры? Згнаю ў турме! Сашлю на Салаўкі! хто за савецкую ўладу—падніміце рукі,—той за колгас, а хто супроць сав. улады, той супроць колгасаў.

Рукі сялян былі падняты. Аніісковіч сьвяткаваў. Перамога!

* * *

— Зрабіў! — урачыста далажыў Кастусь прыехаўшы ў райком.

— Маладзец, ты цяпер заслужыў адпачынак. Пашлем Жалезьнякова замацаваць твае перамогі.

У часе сьнеданьня ў райком быў выклікан Жэлезьнякоў.

— Вось, браток, райком даручае табе завяршыць нашу перамогу, дуй у колгас „Гігант“ організаваны Аніісковічам на прадмет абагульненьня, каб на сто процантаў. Што? Думаеш, крута? Ні чорта ні крута! Аніісковіч інформаваў, што столькі энтузіязму, столькі веры! Словам, крой, посьпех забясьпечан.

— А ўсё-ж, можа літаратурку, якую...

— На чорта літэратуру? Газэтамі трэба карміцца. Ты ведай адно, абагуліць на ўсё сто і ніякіх гаваздоў!.. Каб па-бальшавіцку. Жорсткая клясавая лінія.

* * *

Так, чытач, гэтыя людзі хацелі кавалерыйскім наскокам, адміністрацыйным нажымам, голым загадам і пагрозамі пабудаваць колгасы. Як яны памыляюцца!

Сваімі „мерапрыемствамі“ гэтыя людзі толькі гробяць добрую справу, толькі паганяць лінію нашай партыі.

ЦІШКА ВЕРНЫ.

Папраўка

У № 73 „Ч. З.“, у артыкуле: „Політычная ўстаноўка „настаўніцы Фідроўскай“, на другой балонцы ў першым абзацы па тэхнічных прычынах выпала некалькі слоў:

Надрукавана: ён гаворыць аб... кулаку (!?). Аб якім-жа кулаку можа гаворыць нацыянал-дэмократ Зарэцкі, спытаемся мы ў Фідроўскай, калі ён ня прызнае клясавай дыфэрэнцыяцыі, калі ён бачыць толькі нацыянальны фронт?

Трэба чытаць: ... ён АДКРЫТА гаворыць аб кулаку (!)

Справа ў тым, што Зарэцкі, апісваючы сум чарота, па сутнасьці гаворыць аб суме кулака, але НЕ АДКРЫТА. Ён сваю кулацкую песьню прыкрывае крыкам чарота.

Паштовая скрынка

Чарэйку—„Чыстка савапарату Слабодзкага сельсавету“, Аніісенка—„Далоў валакіту“, „Лёгкаму Кавалерысту“—„Брудиасьць у Барковіцкай спажыўкоопэрацыі“, „у Баркавіцкай коопэрацыі працуе бюрократ“, Зунаву—„Гаспадары ў праўленьні“, А.—„Вораг ворагам і застаўся“, Ян. Зоркаму—„Здаўмеліся“, Вучню ШСМ—„Зьвярнеце ўвагу“, Пятухову—„Кулакі зрываюць колектывізацыю“, Горкаму яблыку—„У рэдакцыю газэты“, Віленчыку—„Культпрацу зьвязаць з працай колгасаў“, Кушынскаму—„Дапамагчы колгасу“, Цімоху Лявіцкаму—„Праца ідзе ўперад“, Комсамольцу—„Перабудуем сельскую гаспадарку“, Бураку—„Аб колектывізацыі“, Грыню—„Далоў дурман—рэлігію“, Царыку—„З гармат па колгасу“, Нядобрым—„Мяшае колектывізацыі вёсак“, Вяроўцы—„Кулак наступае“, Р. К.—„У „Чырвоную Зьмену“, Змагаючаму—„Выканаем загад партыі“, Міхасю В. — „Падрыхтоўка да веснавой сяўбы“, Зоркаму—„Спаткаем вясну па-бальшавіцку“, Блакітнаму — „Чашу—„Кормяць тухлымі каўбасамі“,—пералічаныя допісы ня пойдуць, бо ў іх вы пішаце аб усялякай дробязі. Скарыстайце ў насьценгазэце

Брыгадзіру, Л. К., Кінжалу, Нячыпару, Зоркаму, Кражу, С. К., Кавалерысту, Воку, Язэпу, Міколу П., Рабфакаўцу, Зьлатоўскаму, Пазхорчыку, Жыўчыку, Макару, І. М. Ціхаму, Юнкору, Пралеску, Вілі, П. Я. Неўскаму, Зоркаму, Біньнову, Махнідралу, Пяру, Воку, Шаравару, Скураўцу—вашы допісы накіраваны ў адпаведныя організацыі і ўстановы для расьсьледваньня іх і прыняцьця належных захадаў.

Паведамленьне

Рэдакцыя газэты „Чырвоная Зьмена“ сумесна з Домам Чырвонай арміі наладжваюць 3-га красавіка, а 8-й гадзіне ўвечары ў памяшканьні клюбу Карла Маркса вечар сустрэчы чырвонаармейцаў з музычна-композытарскай і пісьменьніцкай грамадзкасьцю на тэму: „Стварэньне новай чырвонаармейскай песьні“.

Адказны рэдактар
Рэдколегія

Менск, друкарня БДВ.
Галоўлітбел № 599